навучання і рэабілітацыі, раённы Цэнтр культуры, 5 бібліятэк, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, клуб дзіцячага і юнацкага турызму і краязнаўства, раённы Цэнтр нар. рамёстваў і дэкар.-прыкладнога мастацтва, бальніца, 2 паліклінікі, аптэкі і аптэчныя пункты, раённыя тэр. цэнтры сац. абслугоўвання насельніцтва, гігіены і эпідэміялогіі, 2 гасцініцы, 2 дамы быту, пункт калект. карыстання, камп'ютэрны клуб, аўташколы і клубы ДТСААФ, стадыёны, спарт. залы і комплексныя спарт. пляцоўкі, рэстараны, кафэ, гар. рынак, 5 аддз. сувязі і інш. Асіповіцкі гісторыка-краязнаўчы музей. Помнік Вызвалення, Увядзенская царква (2000), касцёл Божай Міласэрнасці (2009). Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, магілы ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — Крыжаўзвіжанская царква (1826).

**АСКЕТЫ́ЗМ** (ад грэч. askētes які практыкуецца ў чым-небудзь; падзвіжнік), прынцып сацыяльных паводзін, які арыентаваны на дасягненне пэўнага духоўнага стану праз абмежаванне фіз. патрэб, адмову ад карыстання матэрыяльнымі дабротамі. Мэта А. — вызваленне ад зямных патрэб, духоўнае засяроджанне і праяўленне адмысловых здольнасцей. А. мае сваёй перадумовай наяўнасць сільнай волі, перакананасць у правільнасці абранага шляху, веры ў свае ідэалы. Быў уласцівы практыцы рада антычных філас. школ (орфікі, піфагарэйцы, кінікі). У раннім хрысціянстве выпрацоўваўся аскетычны маральны ідэал; пазней А. стаў разумецца як шлях духоўнай падрыхтоўкі да выратавання праз плоцевае ўстрыманне, строгасць, самааддансць дзеля бліжніх. Аскетычныя патрабаванні праявіліся ў праваслаўі, практыцы каталіцкіх жабрацкіх манаскіх ордэнаў, брацтваў самабічавальнікаў (флагелантаў). Пратэстанцкія рэфарматары (М.Лютэр) вылучылі ідэю свецкага А. — адмаўлення ад раскошы і абмежавання зямных задавальненняў для засяроджання на дзелавой актыўнасці і зямным поспехе. У антыфеадальных рухах 16—17 ст., веравучэннях некаторых сект А. стаў выражэннем пратэсту супраць бяздзейнасці вышэйшых саслоўяў. Матывам А. можа быць адмова ад карыстання прывілеямі ва ўмовах грамадскай няроўнасці (талстоўцы і інш.). Для традыц. бел. культуры характэрны імкненне да залатой сярэдзіны, пераадоленне крайнасцей як А., так і сібарыцтва.

*Літ.*: Вебер М. Протестантская этика и дух капитализма. М., 1990; Карсавин Л.П. Монашество в средние века. М., 1992. *В.Р.Языковіч.*

**АСКНА́ЗІЙ** Ісак Львовіч (Ісак Лейбавіч; 16.1.1856, г. Верхнядзвінск — 1903), беларускі жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1874—79). У 1880—84 у Італіі, Германіі, Польшчы. Вярнуўся на радзіму, жыў у Віцебску. Аўтар жанравых твораў на тэмы жыцця гарадоў і мястэчак Беларусі: «Яўрэўскае вяселле», «Прыход суботы», «Выпрабаванне жаніха» (усе 1890), «Па пазыку» (1892), «Вандроўныя шаўцы». Пісаў карціны на біблейскія сюжэты («Майсей у пустыні», 1885, «Саламон за працай над «Эклезіястам», «Кат з галавой Іаана Хрысціцеля» і інш.). Удзельнічаў у выстаўках Пецярбургскага аб'яднання мастакоў у 1887 («Тужлівыя весткі») і ў 1890 («На старасці», «Ранішні візіт», «У роздуме»).

**АСЛЕ́ПЛЕНЫ АДНАВО́КІ ВЕЛІКА́Н**, адмоўны казачны персанаж. Вядомы па «Адысеі» як Паліфем. Паводле казачнага сюжэта, які з'яўляецца міжнар. і шырока прадстаўлены ў фальклоры ўсх. славян, у т.л. і беларусаў, трое братоў адпраўляюцца на пошукі бяды, якой не ведалі. Па дарозе ім сустракаецца А.а.в., праз якога яны і дазнаюцца, што такое бяда. Усе варыянты міжнар. казачнага сюжэта арганічна звязаны з бел. казачнай традыцыяй. Ландшафт, які апісваецца (лес, бярозы), хатка, у якой прыпыняюцца браты, і інш. рэаліі і маст. дэталі ўласцівыя бел. нар. казкам.

**АСЛЮ́К** Віктар Мікалаевіч (н. 26.11.1961, в. Ляскавічы Акцябрскага р-на), беларускі рэжысёр, сцэнарыст

*Чыгуначны вакзал у г.* ***Асіповічы.***



*Паравоз-помнік каля вакзала ў г.* ***Асіповічы.***



РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР